Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Віленская вул., № 29.
Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцэй: на 1 г.— 4 р. на 6 мес—2 р. мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.
Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна також падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. | 29 Мая 1915 г. | № 21

**Камітэт Беларускаго Таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны.**

*Адрэс: Вільня Георгіеўскі праспэкт № 11.*
*Тэл. 11—92.*

## Напамінаньне.

Ідзе час, месяц праходзіць за месяцам, і канца-краю не відаць тэй вялікай хмары, што заслала ўсё неба, закрыла сонейка. Вайна разыгралася так, як ніхто неспадзеваўся: столькі ахвяр узяла яна, столькі крыві пралілося, як не бывало ад пачатку дзён...

Колькі йшчэ трэба будзе ахвяр людзьмі і грашмі, — ніхто не згадае. Ведама адно толькі тое, што на поўдарозі яна не затрымаецца,

Вось, па ўсіх краёх, што захоплены вайной, ідзе цяпер вялікая работа; каб так наладзіць жыцьцё, каб народ як найменей цярпеў ад вайны, каб забаспечыць яму кусок хлеба. Гэта — першая мэта ўсіх дзержаў, як тых, што йдуць разам з Расеей, так і ворагоў яе.

Да гэтай работы прыкладае руку ўсё грамадзянство. Яно закладае ўселякіе таварыствы дзеля помачы пацярпеўшым ад вайны, дзеля падмогі селянам у гаспадарцы, дзе не хапае рабочых рук. Земствы і гарадзкіе думы рупяцца аб тым, каб акуратна падвазілі хлеб і ўселякіе харчы там, дзе іх не хапае. Але ў гэтай рабоці выяўляецца ўсё тое, што не дае наладзіць яе, як мае быць. Выяўляецца вялікая патрэба зрабіць тые перамены ў нашым жыцьцю, каторые былі патрэбны здаўна, а цяпер — у часе вайны — бяз іх жыць нельга.

Вось, гэтымі днямі ў Петраградзі адбылося заседаньне прэдстаўнікоў розных думскіх партій— разам с прэдседацелям Гасударственай Думы. Яны, акуратне разгледзіўшы цяперашняе палажэньне, што, каб зрабіць сякі-такі лад, трэба чым хутчэй склікаць Думу, ды каб тамака дэпутаты з розных зямель Расейскай дзержавы выказалі, чаго жадае народ, якіе яго патрэбы, ў чым ёсць недахватка.

Прадседацель Думы, Родзянко, маніцца перэказаць гэта ўсё Гасудару і прасіць, каб Дума была склікана.

Вайна апошнім часам дужа адбілася на нашай старонцы. Ніхай жэ нашы дэпутаты, каторые дагэтуль не падавалі ў Думе ніякаго голасу аб нашых справах і патрэбах, — ніхай яны хаця-бы цяпер, у час нечуванай завірухі, зразумеюць, які ціжар ляжыць на іх,

Не здарма іх выбіралі: ніхай-жэ яны паслужуць тым, хто паручыў ім клапотыць аб сваей долі!

Г. Б.

## На вайне і каля вайны.

**Ешчэ адна ваюючая дзержава.** Рэспубліка Сан-Марыно уздумала такжэ прылучыцца да ўсесьветнай вайны і абвесціла вайну Аўстрыі і Нямеччыне. Рэспубліка гэта распаложэна на ўсходнім берэзі апэнінскаго полувострова, у горах і па абшары ня большая за іншую з нашых валасьцей, бо ў межах яе знаходзіцца усяго адзін гарадок і колькідзесят вёсак. Але рэспубліка Сан-Марыно будзе хіба вясьці вайну толькі на паперы, бо ні войска, ні рыштунку ваеннаго яна дагэтуль ня мела.

**Нямецкая нагрозка.** З гор. Ротэрдама пішуць, што немцы ладзюць новы налёт цэппэліноў на Лондон. Як кажуць налёт на англіцку сталіцу мае адбыцца незабавам. Мейсцэм адлёту паветрантоў бытцым назначэны месты: Бруссэль, Антвэрпэн і Гент.

**Немцы на граніцы Італіі.** Гамбурская адна газэта пішэ, што пад гор. Ляворн немцы першы раз мелі сутычку з італьянцамі. Газэта гэна тлумачыць, што вышэйшае нямецкае ваеннае начальство паслало сумыльля туды сваё войска, каб прымусіць Італію абвесціць вайну немцам.

**Крупоўскіе фабрыкі у Константынопалі.** Адна боўгарская газэта пісала, што нямецкая фабрыка аружжа пад фірмай Крупп, адкрыла у Константынопалі свой аддзел дзеля вырабу ваеннаго рыштунку для турецкай арміі. Інжэнеры і работнікі прыехалі з Нямеччыны у чысле каля 4,000 душ, каторые працуюць дзень і ноч.

**Пакрыцьце ваенных страт Італіі.** «Voss. Zeut.» пішэ, што паводле умовы між Італіей і трохдзержаўным хаўрусам Італія атрымлівае ад апошняго на ваенные выдаткі 5 мільярдоў франкоў. Звыж таго Англія заручае аплату італьянскіх ваенных заказоў у Амэрыцы на 500 мільёноў франкоў і харчоў на 300 мільёноў фунтоў стэрлінгоў (фунт стэрлінгоў — 10 рублёў). Далей трохдзержаўны хаўрус заручае Італіі усе даконче патрэбные ей землі, і, між іншым, узбярэжжэ Адрыятычнаго мора, апрача Антывары. Са сваей стараны Італія абавязываецца даць Сэрбіі выхад у Адрыятычнае морэ і даць пад кірунак трох-дзержаўнаго хаўрусу 1.000.000 войска.

**Намецкіе сілы ў паветры.** Газэты друкавалі гутарку аднаго голяндзкаго газэтніка с сэкрэтаром графа Цэппэліна. Сэкрэтар казаў, што цяпер Нямеччына мае у сваім ваздушным флоце 366 лятучых машын у гэтым ліку 36 дырыжаблёў. Апрача гэтаго, хутка закончыцца бодоўля ешчэ 15 агромністых цэппэліноў, каторые змогуць браць с сабой да 200 пуд. разрыўных рэчэй. Усе пригатаўленьня закончэны будуць у жніўні месяцы, у якім часе немцы і мяркуюць зрабіць свой налёт на Лондан. Калі не мана—то праўда.

## ВАЙНА.

**Са Штабу Вярхоўнаго Глаўнакамандуючаго.**

**21 і 22 мая.** Бітвы у Галіччыне цягнуліся з неаслабеваючым упорам на ўсім фронце ад Віслы да аколіц Надворнай.

На левым берэзі дольнаго Сана нашэ войско, пасьля крэпкаго націску, 20 мая сусім прарвало распалажэньне непрыяцеля і апанавэло не малым шматом умацаванай ім пазыціі у аколіцах Рудніка, дзе захоплена намі да 4.000 паланённікоў, гарматы і многа кулемётоў.

Нашэ наступленьне на ўсім фронце да сутокоў Віслока далей прыяйна развіваецца.

Дзеля таго што Перамышль, паводле стану яго гарматуры і вэркоў, збурэных аўстрыякамі перад здачай яго, быў прызнаны няздольным да саматужнай абароны, то утрыманьне яго у нашых руках ставалося патрэбным толькі да тэй пары, пакуль заняцьце пазыцій, акаляючых гэтае место с поўначы і з захаду, палегчало нашу барадзьбу на рэцэ Сане. С пераходам Ярослава і Радымно у рукі непрыяцеля і з далейшым расшырэнемся яго на правым берэзі названай рэкі, утрыманьне спамянутых пазыцій прымушало нашэ войско вясці бітву на дужа не карысным у лукаткі фронце, расцягіваўшым яго больш чым на трыдцаць пяць вёрст і выстаўляўшым войско, каторае займало гэтые пазыціі, згушчэннаму агню многалікай цяжкой гарматуры праціўніка. Дзеля гэтаго ешчэ колькі часу таму назад было прыступлено да заўчаснаго вывоза з названаго пункта рознай маетнасьці, перайшоўшай у нашы рукі ад аўстрыякоў. Па сконченьню гэтай перавозкі, 20 мая намі былі прыняты апошніе гарматы і ноччу на другі дзень нашэ войско, згодна з атрыманымі імі загадамі, пакінуло паўночны і заходны фронты пазыціі, акаляючые спамянуты вышэй горад, заняўшы больш сціслые распалажэньня на ўсход ад яго. Напады непрыяцеля, робленые ім між Перамышлям і Днестрам праз 19 мая намі адбіты.

У Заднестроўскай акрузе непрыяцелю, сціснуўшаму к месту Стрыю вельмі значные сілы, удалося пасунуцца на фронце між Тісмяніцай і рэкой Стрыем, пры гэтым, аднача, вораг меў вельмі вялікіе страты, мы-ж захапілі у часе нашых процінападоў да 1.000 паланённых

На Свіцы і Ломніцы 19 мая мы ціснулі непрыяцеля, на Быстрыцы карысна адбілі яго напады.

На іншых мейсцох агульнага фронту без перамен.

**26 і 27 мая.** У Шавельскай акрузе непрыяцель, атрымаўшы падмацоўку і перагуртаваўшы сваё сілы, пачаў упорыстые напады у кірунку да Бубье. 25 мая нашэ войско пакінуло гэту вёску і сышло на пазыцію перад Шаўлямі.

На дольнай Дубісе наш рух уперад развіваецца даволі прыяйна.

На левым берэзі Віслы на поўнач ад Равы немцы, карыстаючы з ветру у наш бок, ізноў прабавалі атруціць нашэ войско атрутным чадам.

У Галіччыне цягнецца далей заўзятая бітва на левым берэзі Вішні, дзе непрыяцелю 24 мая удалося паціснуць нашэ войско, усё-ж такі пры процінападах намі за суткі захоплена тут да 2.000 паланённых.

На Днестроўскім фронце бітвы цягнуліея 24 і 25 мая, між рэкамі Тісмяніцай і Луквай. Напады непрыяцеля на нашы права-берэгавые умацаваньня ад Угарстбэрга да Жыдачова ня мелі ніякай выгранкі. Каля Жыдачова намі захоплена да 300 паланённых с 6 афіцэрамі 2 кулямётамі.

На левым берэзі Днестра каля Журавно моц непрыяцеля павялічылася і раскінулася па лесі да чыгункі.

На прарым берэзі Днестра немцы у кірунку да сялібы Сіўка папаліся у асочыну. Быўшы у калонным шыку, яны былі абстрэляны с кулямётоў, а пасьля хуткім штыкавым націскам да 200 немцоў было заколата, а колькі дзесяткоў узята у палон.

Напады непрыяцеля між Сіўкай і Луквай намі адбіты.

## Аб пажарах.

Гуляіць па нашых вёсачках, цяпер у гэту пякоту, чырвоны певень, чырванеіць неба ат пажароў і ў вогнішчы, то там то сям, адна за аднэй абарачваюцца у попел сялібы, са ўсім нашым скарбам. Там дзе лізнуў сваім языком агонь, ад усяго дабра астаюцца толькі чорные, раскіданые агаркі. Астаецца у адных кашульках, сямейка пагарэльца, без прытулку, без кавалка хлеба. Астаецца гаспадар гол-галусенькі, як кол і ня ведаіць куды яму кінуцца, за што узяцца.

Бог пакараў — кажэ пагарэлец.

Вядзець ён сваю сямейку, жонку і дзетак да суседа, просіць каб прытуліў іх, хоць у варывенцы дзе, а сам надзяець торбу на шыю, запрэгаець каня і пхнецца

ад вёскі да вёскі, просючы злітавацца над ім і падарыць на пагарэлае. Шмат гэтых гаротнікоў, перэбываіць за лета, у кожнаго гаспадара і ніхто не атказваецца даць на пагарэлае і дзеліцца тэй самай крошкай, чым толькі можна.

Страшна падумаць, якую вялікую шкоду робіць нам пажар. Цэлых вёсак жыхары становюцца жэбракамі і доўгіе гады пагарэлец ня можыць падняць на ногі гаспадарку, ня можыць акрэпнуць, после такога страшэннаго зніставжэньня. Шмат хто так і ня уз'біўся на гаспадарку і павек астаўся жэбраком, с торбай на шыі.

Колькі кладзем мы крывавай працы, пры нездабытках у нашай гаспадарцы. Усяго хочыць, гаспадар прызапасіць: і снасьцінку і і адзежку. Колькі гадоў, мо збіраіць аўчынкі на кажушок, на сярмяжку воўначку. Колькі нашы сёстры ці дочкі кладуць працы у куфар, з якім маніцца выйсьці у людзі, колькі там трубачак палатна, тоненькіх ручнічкоў, колькі там убороў, на якіе мо колькі год хадзіла у двор на заработкі. Усё гэта не застрахавана, не прадасцярожана ад агню у нас і пры пажары без усякага ратунку прападаіць наша праца ні за што.

Бог пакараў — кажэ пагарэлец.

Не так Бог, як наша недбайлівасць.

Праходзючы праз нашы вёсачкі рэдка дзе можна убачыць кадку з вадой ля хаты, і іншымі пажарнымі прыладамі, хаця на вуглах і папрыбіваны дошчэчкі, на якіх намалеваны тые рэчы, якіе гаспадар павінен мець, барані Божэ пажару. А калі у каго які крук зроблен і ляжыць на вышках, ды пры патрэбі ні так скора яго і знайдзіш. Загарыцца-ж дзе хацінка, злятуцца к вогнішчу суседзі, а ратаваць і німа чым. Пакуль там дзе с сажаўкі прынясуць вядро вады, дык тут глядзіш, ужо шматкі саломы з агнём, переносюцца ветрам з будынку на будыніну і ніўзадоўгі час уся вёска шугаіць у вогнішчы.

Вінаваты мы іў неасьцярожнасці з агнём. Гаспадар бывае ідзець у пуню спаць і улёгшыся у сена курыць папіросу іскры с папіросы сыплюцца па сенэ, а то і папіроса пры драмоце,ываліцца з рук ад якой і загараецца. У хаці ізноў, запаліўшы лучыну, ды ешчэ узяўшы у зубы, калі рукі заняты, ідуць праз сені ў істопку, бывае вецер падзьмухнець, падкруціць, ды вугаль з агнём і закоціць у кудзелю ці якіе манаткі. І ад гэтага самымі улёгамі зашугаіць агонь так што ня ўсе і з душамі паўцекаюць.

А сколькі бывае пажароў, што ў пільніцу дзеткі астаюцца дома без даглёду?

Вось браты, каб ня мець гэтулькі бяды ад пажароў, каб недапусьціць агню ад загарэўшай будыніны на ўсю сялібу, дзеля гэтаго нам трэба у кожнай вёсачцы зладзіць пажарную дружыну. Абойдзецца гэта ні саўсім дорага. Машыну с кішкой можна дастаць рублёў за 100. Калёсы да яе, дзежкі, вёдры, крукі, драбіны,— гэта знайдзецца у саміх. Усё гэта трэба зрыхтаваць пры адным мейсцы, кожную рэч прыспасобіць к свайму назначэньню. Дзержаць пры вуліцы у асобнай паветцы. Практыкавацца можна у сьвяточные дні, у прысьвяткі. У каманду трэба станавіцца маладзейшым, бо стары вядома не так здацен, а тут бываіць вёрткая работа. Стаўшы у дружыну, грошы за працу ніхто не бярэць, а маюць пашану ат суседзёў. Аб тым як залажыць гэту дружыну, як яе зацьвердзіць, які яе кірунак і аткуль дастаць машыны, аб усім гэтым ахвотна у кожнай воласьці павінен растлумачыць пісар. Трэба каб толькі захацелі селяне змагацца з агнём, а патрэба гэта вялікая у нас.

Пытаньне зб змаганьні з агнём, павінна быць, у кожнай вёсцы, пастаўлена на першы чарод.

**Міхал Скарэўскі.**

---

## На біблійны лад.

**Ісая XXXIII.**

Аплодненые вы бязсеменнай мякінай —
Дуплістую салому будзеця радзіць;
Насеньне гэткае пагібель для краіны,
Дык хай зярно пустое полымям гарыць!

---

# АБМЫЛКА.

Гэта было даўно...

Доля, каторая іншы раз так-жэ бяз спогадзі і жалю трэпле чэлавека, як віхор сарваны з дрэва лісток закінула мяне у адну вёску, стаяўшую пад Белавежскаю пушчаю, паміж старых, хмурных хвоеў. З аднаго боку гэтае вёскі цягнулося полё, з разсыпанымі па ём кустамі заўсёды зялёнаго, калючаго ядлоўца, а з другога—сьцяною стаяў густы, цёмны бор.

Пакаленё сходзіло за пакаленем, вёска некулькі разоў выгарала, некулькі разоў меняла свой убогі, жэбрацкі выгляд, а хмурны, маўчлівы бор задумаўшыся ўсё стаяў бэз перамены, як зачараваны волат. Толькі у восенную непагоду, пад націскам гуляўшаго ветра, яго жорсткае, калючае вецьцё прачыхаласё ад сна і пачынало маркотна шэптацьця паміж сабою...

Аб чом думаў хмурны бор, аб чым шэптапося яго вечна-зеленаё вецьце, — астаецца глубокаю таемніцаю...

Жыхары вёскі—маўчлівые як бор і прастадушные як дзеці, — будні нылі над работаю, а сьвята толькі елі ды спалі, іншых спраў, апрыч здаволеньня цялеснае патрэбы, у гэтых дзяцей прыроды не было. Дый хто мог разбудзіць іх ад вечнаго спаньня і улажыць у іх душу вышэйшые духоўные інтэрэсы, калі апрыч бору, яны праз усё сваё жыцьцё нічога больш не бачылі. Паветовы горад быў так далёка, што аб ём можна было толькі гадаць, як аб Абраамавым лоне; нават мястэчка, гдзе была цэрква і школка, прыходзіласё у 50 верстах і дабрацца туды асабліва у разводзіцу, трудней было чым да паўночнаго полюса.

Жыць у гэткай глухарне чэлавеку, у катораго могуць быць апрыч яды і сна, другіе, вышэйшые патрэбы, такжэ цяжка, як вольнаму чэлавеку, каторы трапіў у адзінокую цямніцу. Самые лепшые мысьлі і самые кволые пачуцьця у гэткім жыцьцю застаюцца бяз водгаласу, губюцца і ўміраюць як адгалоскі ў пустыні. Асабліва нуда заедае у сьвята, як проці ночы дакучліва пачнуць лезці у галаў успамінкі пройдзенаго жыцьця сярэд вясёлых сяброў і прыяцелёў сваіх; пры гэткіх успамінках нуда пераходзіць у цяжкую, гнятучую муку. Тады чэлавек рад бывае усякай нявіннай забаве.

От чаму я вельмі зрадаваўсё, як на Трыкролі, зранку, ад свайго сябры Тамаша Баравіка атрымаў цэдулку з запрошэньнем прыехаць да яго на вечарынку.

Пап Баравік быў багаты шлялціц, ён жыў у лесі за 20 верстоў ад тэй вёскі, дзе я каратаў свае жыцьцё. Яму было ужо лет за 50, але ён лічыў сябе ня больш 30 і вельмі зліўся, як хто-небудзь хоць ненарокам намекаў яму аб старасьці. Ён кожны дзень чыста галіўся і надта добра даваў таргаваць вэнграм, у каторых часта купляў слоікі с памадкамі дзеля свайго туалета; ад гэтых памадак яго бледны твар рабіўся чырвоным, а сівые валасы на барадзе і галаве ставаліся цёмнарусымі. Наагул пан Тамаш вельмі любіў маладзіцца. Дый ня дзіва: у яго была надта маладая, лагодная і пекная жонка; от яму і трэ было зраўняцца з ею, хоць с помаччу купленых памадак. Пан Баравік быў успыхчывы як порах, але успыхнуўшы зараз аттухаў і станавіўся мяккім, як выцертая ганучка. Ён быў збыць добры, прыхільны да ўсіх і за гэта усе у аколіцы яго любілі і часта з'ежджаліся да яго у госьці.

Прачытаўшы цэдулку с прозьбаю прыехаць у госьці, я пазваў свайго суседа, крывога і сьляпога на адно вока Цімука, і вялеў яму пайці на вёску і наняць падводу, а сам стаў выбірацца да ад'езду.

Цераз гадзіну можэ с чым вернуўся Цімук і, сумна пагледаючы на мяне сваім відушчым вялікім вокам, стаў пецярнёю чухаць патыліцу. Гэта абазначало неўдачу.

— Ну, што? — ўскрыкнуў я, дагадваючыся, што атвет будзе кепскі.

— Не выходзіць, як той казаў, дзела, — сіпеў Цімук, перэбіраючы пальцамі сваю пляскатую як блінец шапку: абыйшоў усю вёску, але ніхто ня хочэ... Верэмя, бач, паганае... Усе, як той казаў, пужаюцца...

— Я зусім не разумею, што т ы кажэж,— крыкнуў я, — чаму усе пужаюцца?..

—А хіба вы, паночку, ня чулі, як той казаў , пра Бандарчука? Тут Цімук збялеў і скорчыўшыся прытуліўся да сьцяны, так што здавалося, быдта яго нехта хочэ парнуць нажом у бок.

Як толькі Цімук напомніў мне пра Бандарчука, я зразу адгадаў, чаго усе «пужаюцца». Бандарчук быў разбойнік, душагуб. Ён некалі быў сасланы у Сібір, але адтуль уцёк і прыйшоўшы на бацькаўшчыну у Белавеж, сабраў каля сябе шайку разбойнікоў і стаў з імі нападаць на людзей, асабліва на багатых паноў, грабіў хто пападаўся у яго рукі і забіваў.

Паміж людзей у вёсках пра гэтаго разбойніка хадзілі самые страшэнные чуткі.

Гаварылі, напрыклад, што пад першую Коляду Бандарчук прыкінуўся зблудзіўшым дзяком і папрасіўся у аднаго сьвяшчэнніка на начлег. Добры бацюшка прыняў яго вельмі ласкава, накарміў і напаіў па горла; але разбойнік атплаціў яму за гэта па своему. Як адно пападзя з дзяцьмі пайшла спаць, «госьць» выняў з-захалявы нож і прыставіўшы яго да горла сьвяшчэнніка шэпчучы сказаў: «а падай сюды грошы!..» Бацюшка спалохаўшыся атчыніў яму куфар і паказаў грошы. Бандарчук забраў іх і уцёк.

Расказывалі такжэ, што пад Новы Год гэты бадзяга зайшоўся да аднаго лесьніка і увалок у пушчу яго маладую жонку, а праз два ці тры дні прывёз яе труп і кінуў таму-ж лесьніку у вакно.

Праўда, у гэтых расказах многа было выдумак вясковых бабак, здольных усяку бытавіну зрярнуць на казку, але у іх многа было і праўды: людзей скрыўджэных, аграбленых і пабітых на сьмерць Бандарчуком было у Белавежы не мала. Сваймі разбоямі ён навёў такі вялікі страх на ўсе вёскі, што жыхары нават у дзень баяліся выежджаць за аколіцы. То й дзіва німа, што Цімук, будучы верным маім услужнікам, ніяк ня мог знайці ахвотніка ехаць са мною да пана Баравіка. Але я цьвёрда пастанавіў вечэр на Трыкролі правесьці у вяселай кампаніі.

Заліў быдлячы лой валоўі вашы грудзі—
Вы без душы, бяз сэрца, бяз вушэй, вачэй...
Калі німа ў нас лепшых, хай і вас ня будзе!
Дык згінця вы, як цені жудасных начэй!

А рукі вашые атручны і брыдкі,
А плечы вашые, бы куча гнілых дроў;
Напоўнены сьлезамі вашые дабыткі,
На вопратках шаўковых зіхаціцца кроў...
Наганіця дыханьнем вы зямлю і неба,
Хапаецця клыкамі ўсюды, як зьвяры;
Пякельнікам у рукі на цацкі дадзь вас трэба,
Спіхнуўшы ў чорну яму с залатой гары.

**Ясакар.**

## На варці.

Стаіць ён на варці і плюшчуцца вочы,
І цела хацело-б пайсьці на спакой,
Заснулі бажаньня, нічога ня хочэ,
Ня можэ крануці рукой.

Тры месяцы з дому... Сабраўся ад жніва,
З народам паходам пайшоў ваяваць...
—Успомніцца часам — як там, ці жывы?
А хто дапамог ім звазіць, паараць?

Тры месяцы з дому... Акопы, атакі,
Гарматы, гранаты і тысячы куль...
А як там у хаці мае небаракі, —
Ніякае звесткі аттуль?

Каруся адна.. Ці памогуць суседзі?
А хіба-ж маглі-бы іначэй зрабіць?!
Бо маюць жа сэрцэ, і ён, як прыедзе
Здалее за ўсё і усім атплаціць.

Суседзі памогуць!.. Што-ж дзеецца ў вёсцы?
Ці спорны, ці чорны удаўся там год?
Якое надвор'я, ці сьнег, ці марозцы?
Ці, можэ, завеі? Які-ж у малот?

Стаіць ён, вартуе, зліпаюцца вочы
І цела хацело-б спакою, заснуць...
А сэрцэ спакою не знае, ня хочэ,
А думкі ад варты лятуць, ды лятуць!

Люты, 1915 г.

**Алесь Гарун.**

# Да грамадзян Беларусі.

Памагаць бліжнім у бядзе — гэта павіннасць усіх, хто жывучы у вялікай сям'і людзкой, бачыць у кожным чэлавеку — брата. Гэта — наказ, ад катораго ніхто ня вольны, калі у яго сэрцы захаваюцца словы адвечнай сьвятой запаведзі: любі бліжняго свайго, як сябе самога.

У пачатку вайны с сумежных з намі зямель Польшчы і Літвы панаехала у нашу старонку багата людзей, у каторых вайна забрала ўсё: хаты, зямлю, меньне, заработак. Са сваіх вёсак і мястэчак пацягнуліся да нас сотні і тысячы палякоў, жыдоў, літвіноў.

І беларусы, памятаючы сваю павіннасць, як мага адгукнуліся на іх нядолю: з беларускіх валасцей селяне слалі грошы і збожжэ польскім селянам; на местах беларускіе грамадзкіе працаўнікі ахвоча ішлі працаваць у камітэты, што памагаюць усім пацярпеўшым ад вайны—бяз розніцы нації і веры; беларускіе гурты устраівалі зборы грошы і спэктаклі на іх карысць і т. п. Ажно прыйшоў час, што хваля вайны закранула і Беларускі край. Пагарэлі у часі бітвы беларускіе вёскі і мястэчкі. Скрануліся з мейсца нашы шэрые гаротнікі ды памандравалі у глыб сваей старонкі — без куска хлеба, без граша у каліце, адно з голымі рукамі. І вось да нашых грамадзкіх павіннасцей прылучылася іншэ адна: дагэтуль нам давадзілося памагаць нашым бяздольным гасьцям, цяпер жэ мы павінны даць падмогу і прыпынак сваім сыном зямлі Беларускай, спрадвечным жыхаром яе.

Гэта ўжо ня простая падмога бяздольнікам: гэта — самапомач, бо, памагаючы нашым братом родным, мы памагаем самі сабе, беларусы-беларусам.

Каб спаўніць гэту павіннасць, трэба злучыць нашы грамадзкіе сілы, трэба наладзіць шырокую на ўвесь край — організацію дзеля помачы пацярпеўшым ад вайны. Да гэткай работы і прыступіло «Беларускае Таварыство помачы пацярпеўшым ад вайны» аткрытае у Вільні.

Дзьве мэты ставіць яно сабе. Першая — даваць апеку, справу, прыпынак і лекарскую помач тым, што пакінуўшы свой куток разыйшліся па зямлі беларускай—у межах губэрній віленскай, гродзенскай, мінскай, віцебскай і могілёўскай. Другая мэта — там, дзе прашла ваенная навальніца і сьцерла з зямлі вёскі і мястэчкі, памагаць народу адбудоўваць знішчоныя хаты, наладзіць гаспадарку і здабыць спосаб ізноў узяцца за працу дзеля куска хлеба. Каб гэта спаўніць, патрэбны грошы і організація аддзелоў таварыства— у раёне вайны і па гарадох, мястэчках і вёсках усяе Беларусі.

Паводлуг статуту таварыства, зацьверджэннага віленскім губэрнатарам 29 красавіка 1915 году за № 3, там, дзе збярэцца пяць членоў, ужо можна аткрыць аддзел, каторы мае права зусім незалежна вясьці намечэную статутам работу. Гэтак параскіданы на шырокім абшары нашай бацькоўшчыны беларускіе грамадзкіе працаўнікі і усе, хто спагадае рабоце таварыства, могуць прыкладаць свае сілы і хаця-бы невялікіе грашавые ахвяры да усенароднай працы на самапомач і на падмогу усім тым, каго нядоля кінула на нашу зямлю.

Ніхай-жэ усе шчырые беларусы і усе праўдзівые грамадзяне Беларускаго краю бяз розніцы веры і нації адгукнуцца на гэты наш кліч, ніхай прыступюць да «Беларускаго таварыства помачы пацярпеўшым ад вайны», ніхай памагаюць яму працай сваей і грашмі, каб споўніць сваю грамадзкую павіннасьць перад Родным краем, споўніць вяліку запаведзь любві да чэлавека.

**Камітэт.**

**У Камітэт Таварыства выбраны:**

Маршалак: **В. Іваноўскі**
Наменснікі маршалка: **А. Луцкевіч і В. Ластоўскі**
Пісары: **П. Алексюк і І. Біндзюк.**
Скарбнік: **В. Столыгва.**

— Ты быў у карчмара Іцкі? — спытаўсё я у Цімуха, каторы усё ешчэ стаяў сагнуўшыся каля сьцяны і дрыжэў ад страху: у яго, нябось, ёсьць коні і ён не атказжацца паехаць са мною...

Цімук скрывіў свае тоўстые мясістые вусны і уедліва усьміхнуўся.

— Што гэта вы, як той казаў... адвеціў ён, прыплюснуўшы сваё відучае вока: калі нашы, як той казаў пужаюцца, дык гдзе-ж ужо жыдку паехаць... Ен цяпер, як той казаў, і на двор з дому не выходзіць, на-нач усе вокны забівае дошкамі...

— А усе-такі ты схадзі і пагавары з ім,— сказаў я ўласна Цімуку.

Цімук паціснуў плячмі і, устрахнуўшы сваею кудлатаю галавою, нехаця пашоў да Іцкі.

Мяне надта цягнуло да Баравіка. Мысль, што я вечэрам не пападу у госьці і вынуджэн буду астацца адзін дома, як клешчамі шчаміло маё сэрцэ і пякельна мучыло мяне. Мне вельмі хацелося правертыца, павесяліцца і хоць трошкі разагнаць сваю нуду... Апрыч таго, мяне цягнула туды, як будзе вытлумачэно далей, і другая прыманка...

Баравік у нізе сваей цэдулкі прыпісаў; што у яго на вечарынцы неадменна будзе родзічка паненка Антося. Антося была дзяўчына асаблівай красы, вельмі прыхільная, сымпатычная, надта добра адукаваная, з мяккім, добрым сэрцэм і поэтычнай душой; яна артыстычна грала на фартэпьяне і на скрыпцы; яе музыка прыводзіла ў салодкі настрой самых сухіх, жорсткіх людзей. Будучы вясёлай, здатнай і лагоднай, яна усюды мела многа прыяцелёў і залётнікоў; усе яе бажалі, любілі, а мужчыны старые і маладые ад палючых яе вачэй сходзілі з вума; але на ўсе іх залёты і бажаньня яна не звертала ніякае увагі і нікому не ўдзеляла асабліваго чуцьця. Як сонейко адзінакава ліе свае залатые праменя на пышные ружы і на калючые асоты, так і гэта добрая дзяўчынка з адным і тым-жэ поглядам звярталася, як да цяцюкоў першае пекнаты, так і да брыдкіх старых мужчын. Быць з ею, глядзець на яе пекную, праменную постаць і слухаць яе не зямную музыку — было такім шчасьцем, катораго славамі і выявіць трудна. Сымпатыя да гэтае рэдкае паненкі, а можэ быць і другое, болей сур'ёзнае пачуваньне і было тым магнэсам, што ўласна цягнуў мяне да Баравіка на вечарынку.

З вялікім нецярпенем і трывогаю я ждаў Цімука, але ён недзе запрапасьціўся і яго доўга не было. Прашло ешчэ некулькі цягаспых хвілін, і от, чую, у сенях нехта дробна затупаў нагамі; зараз заскрыпелі і атчыніліся дзверы і у хату укаціўся ўмесьці з марозам у парваным футры і у цёплай, рыжай, шапцы сам Іцка, высокі і сухі, як ражон, жыдок з рэдзенькаю бародкаю і з маленькімі, заўсёды слезяшчымі, мокрымі вачамі.

— Ай—вай—вай! Ну і верэмяцко пан выбраў ехаць у госьці... Уф! якое верэмяцко!.. затараторыў Іцка, размахваючы сваімі ня умеру доўгімі рукамі: цяпер ехаць да пана Баравіка усё роўна, што ісьці на вайна... На дарозі мо гдзе якраз сядзіць Бандарчук...

— Але перэстань ты малоць! крыкнуў я: гавары адразу, паедзеш ці не?

— Ай-вай! ай, як можна, як можна.. зноў затрэшчаў Іцка.

— Кажы, колькі возьмеш? перабіў яго.

Іцка заміргаў слязлівымі вачамі і працягнуўшы уперад голаў, як кот угледзіўшы кусок сала сказаў:

— Ну, с пана я дорага не вазьму: дасьце 20 карбаванцоў і з Іцка будзе досыць...

Я аблаяў жыдка скуралупам, але у душы быў вельмі рад, што ён не атказаўся, хоць узяў разбойніцку цану.

— Ідзі-ж барджэй і запрагай! — крыкнуў я.

Жыдок пакланіўся і выйшаў.

Пад вечэр на пары худых, заезджэных коней запрэжэных у старые, крывые сані, пад'ехаў к ганачку тэй хаткі, дзе я жыў, Іцка, закутаны з ног да галавы у лахмоцце, так што ён больш паходзіў на патарочу, каторую з ганучу вясной ставяць на агародах, чым на жывога чэлавека. Я выйшаў на двор. Сонцэ было ужо на захадзе. Над борам с крыкам летала плойма варон.

Я сеў у сані. Да мяне ціха падыйшоў Цімук і, працягнуўшы сваю мазалістую пяцярню удоўж дарогі, шэптам сказаў:

— Паглядзі, паночку, як той казаў, як пачынае круціць...

І спраўдзі, з лесу па дарозі ляцеў на нас, крущачыся сьнежным стаўбом, віхор.

— Гэта, як той казаў, паночку, кепская прымета, — казаў далей Цімук: добра каліб паехалі са сваім чэлавекам, а то з нехрысьцем.. Хоць бы, як той казаў, не прылучылося, ніхай Бог сьцеражэ, якое бяды...

— Пустое, Цімук... отказаў я і вялеў Іцку ехаць. Ен падабраў лейцы, улез на перадок саней і узмахнуў пугаю; коні рвануліся і пабеглі рысью па роўнаму, наежджанаму гасьцінцу.

Цімук доўга стаяў на дарозі і косючы голаў праваджаў нас сваім вялікім відучым вокам..

Дарога йшла лесам. Па бакох скрозь стаяў сьцяною густы, высокі бор. Пачало вечарэць. Цені паміж дрэў усё больш ды больш згушчаліся і зараз наступіла ноч. У лесі было ціха, толькі чутно было як порскалі коні ды недзе далёка у цемры жаласна крычэла начная птушка. . Іцка сагнуўшыся у тры пагібелі, дрыжэў са страху, як асінавы ліст у непагоду. Ен едучы не зраніў ні аднаго слова, сядзеў бытта нямы; нават і коней не паганяў сваім «ны-ны!» а каб прымусіць іх барджэй бегчы, проста пароў іх пужалнём у балючые мейсцы.

Далей памалу стаў радзець лес, дарога пашырэла, хвоі раптам разбегліся, паказаліся на небі зоркі, і мы зразу выехалі на шыроку паляну, на каторай на узгурку купаю стаялі будынкі,—гэта і быў маёнтак пана Баравіка.

Увесь двор быў устаноўлен санямі, у стайнях сапелі і порскалі жывучы сена, коні, каля ганку стаялі і грамадкамі і дудукалі паміж сабою фурманы. Неба было чыстаё і зорыстае. Мароз крапчэў...

(Канец будзе).

